*Вячаслаў Красулін*

## СІНТЭЗ МАСТАЦТВАЎ У ПОСТФАКЛЬКЛОРНЫМ КАЛЕКТЫВЕ
***(на прыкладзе гурта «Ліцвіны»)***

Пачынаючы з першых фіксацый фальклорных спеваў і музыкі ў XIX ст., прафесійныя кампазітары імкнуліся ўнесці фальклорныя мелодыі ў структуру складаных аўтарскіх твораў. У выніку, самі таго не заўважаючы, разбуралі арыгінальную мелодыку народнай музыкі, яе этнічны складнік, магічная аўра якой не падпарадкоўваецца, як на першы погляд можа падацца, законам класічных музычных сістэм. У выніку ў гарадскім асяроддзі Беларусі XX ст. з'явілася культурнае поле т.зв. «фальклярызму».

Але пры канцы 1970-х – пачатку 1980-х гг. «рамантычна настроеная моладзь імкнулася да вывучэння сваёй гістарычнай спадчыны. У тым ліку да вывучэння фальклорна-этнаграфічнага матэрыялу з імкненнем узнавіць і укараніць яго на сучаснай культурніцкай глебе» [2]. Гэта дало штрушок да з'яўлення грамадскіх аб'яднанняў, якія на сваім прыкладзе дэманстравалі жывое аднаўленне традыцый. Але паколькі то былі жыхары з гарадскога асяродку, яны маглі толькі імітаваць аўтэнтычныя абрады, спевы, вопратку. Лагічна з'явілася праблематыка адрознення праяў народнай культуры ў вясковым і гарадскім асяродку. У выніку ў 1990-я гады з'яўляецца тэрмін «постфальклор» [4].

Адным з удзельнікаў беларускага постфальклорнага руху ва ўрбанізаваным асяродку быў унук Аркадзя Куляшова – Уладзімір Бярбераў. Нефармальнай студэнцкай суполкай ладзіліся этнаграфічныя экспедыцыі, падчас якіх ён адкрываў для сябе дзівосны свет фальклору, знаходзіў непаўторныя творы, фіксіраваў іх.

Найбольшы запал лідар «Ліцвінаў» Уладзімір атрымаў падчас удзелу ў гурце «Дзянніца» пад кіраўніцтвам вядомага кампазітара, харэографа-пастаноўшчыка, спявачкі Ларысы Сімаковіч. Менавіта тады, у сярэдзіне 1980-х гадоў ён вырашыў прысвяціць сябе музычнай і даследчай дзейнасці ў кірунку беларускага фальклору.

На адным з вяселляў увосень 1987 года ўпершыню сустрэліся Наталля Матыліцкая і Уладзімір Бярбераў, які шукаў салістку для свайго музычнага праекта. Матыліцкая, родам са Случчыны, толькі пачынала спрабаваць сябе ў народных спевах, пераняўшы манеру ад вясковых бабуль і закахаўшыся ў гэтае мастацтва. Уладзімір Хрыставіч марыў стварыць гурт, заснаваны на сапраўдных, музейных узорах народнага інструментарыю, адзення і выканальніцтва, «жывы працяг музея». Погляды абодвух на музычны фальклор супалі, і праз год дуэт дэбютаваў на сцэне мінскага Дома літаратара.

У 1990 годзе да дуэта далучыліся Ксенія Дзягілева – скрыпачка з талентам да імправізацыі, і Мікола Трус – тэнар, родам са Слонімшчыны. Тым жа летам гурт узяў назву «Ліцвіны» – у памяць пра «залаты век» беларускай гісторыі – перыяд Вялікага Княства Літоўскага.

1991 год стаўся гістарычным для «Ліцвінаў». Напрадвесні да гурта далучыліся Алена Шэўчык (родам з-пад Лунінца) і Наталля Захаранка (родам з Васілевічаў, Гомельшчына) – спявачкі, для якіх народная песня была сваёй з дзяцінства. Увосень прыйшлі Марына Грыбок (родам з Валосаўкі, Наваградчына) і Людміла Януковіч (з Кабыльніка, што недалёка ад возера Нарач). Усе, апроч К. Дзягілевай (студэнткі жывапісу) і У. Бярберава, былі студэнтамі філалагічнага факультэта БДУ. Шасцёра паходзілі з вёсак. Усе перанялі выканальніцкую манеру або ад аўтэнтычных носьбітаў (Н. Матыліцкая, У. Бярбераў), або атрымалі яе ў спадчыну ад сваіх бабуль (А. Шэўчык, Н. Захаранка). Кожны дадаў да ідэі гурта сваю яркую індывідуальнасць, адрозную ад астатніх, і традыцыі сваіх родных мясцін.

На пачатку свайго існавання гурт адразу абраў для сябе дакладную мэту – імкнуцца ў сваёй творчасці да капэлы народнай музыкі ўзору пачатку XX стагоддзя. Уладзімір Хрыставіч пільна сачыў за адпаведнасцю рэпертуару, музычнага інструментарыю, манеры спеваў, строяў, нават за знешнім выглядам удзельнікаў гурта. Рэпертуар, назапашаны ў экспедыцыях, развучваўся «на слых». Інструменты, якія яшчэ можна было сустрэць на вёсцы, у сваіх родных і сваякоў удзельнікаў гурта абавязкова «ажывалі» і ўпісваліся ў ансамбль. У музычную аснову была пакладзена каранёвая інструментальная традыцыя беларусаў, у падмурку якой знаходзяцца такія складнікі, як «дударская музыка, смыковая музыка, траістая музыка, шчыльна звязаная з нацыянальным меласам як сістэмай. Бо песня, інструментальны найгрыш, танец у традыцыйнай культуры беларусаў шчыльна знітаваныя паміжсобку» [3, с. 12].

У Мінску на канцэртнай прэзентацыі дэбютнага дыска «Ліцвінаў» публіцы выдаўся рэдкі на той час пачуць на свае вушы беларускую дуду, сапраўдныя этнаграфічныя цымбалы Маладзечанскага рэгіёна, сапраўдную паляшуцкую дудку і іншыя традыцыйныя інструменты. Бо ўжо ў пачатку 1990-х не тое што ў гарадскім асяродку, на вёсцы ўжо было складана пачуць музыкаў-выканаўцаў на гэтых інструментах.

Самым значным феноменам сталася не доўгае існаванне гурта, а тое, што ў «Ліцвінах» удзельнічалі навучэнцы сталічных універсітэтаў. У гарадскім асяродку на час выхаду дэбютнага альбома бытавала меркаванне, што фальклор – нейкая непрэстыжная з'ява, якой цікавяцца толькі старыя бабулькі. Сваёй шчырасцю і адказнасцю ў рэпрэзентацыі народнай музыкі, грунтоўным падыходам да прадстаўлення фальклорнай спадчыны праз завершаны вобраз гурта «карчмы пачатку XX стагоддзя».

За дваццаць сем гадоў існавання гурт выпусціў чатыры канцэптуальныя альбомы: «Галуб на чарэшні, галубка на вішні» (1992), «Неба і Зямля» (1994), канцэртны «5 сакавіка» (1996), «Ой, у лузе-лузе…» (1998).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Цяпер, пры асэнсаванні шляху «Ліцвінаў» да рэалізацыі сваёй мэты – стварэння музычнага гурта, максімальна набліжанага да аўтэнтычнага, бачна удалае ўвасабленне народнага калектыву ў постфальклорным асяроддзі. Лепшы доказ мастацкай вартасці гурта – далучэнне фальклору ў структуры сучаснага шоў-бізнэсу: шматлікія канцэрты, неаднаразовыя перавыданні альбомаў на аўдыё-касетах і кампакт-дысках, вядомасць у колах сучаснай моладзі, якая цікавіцца фальклорам, прызнанне фалькларыстамі-навукоўцамі [1, с. 239].

Безумоўна, у гурце «Ліцвіны» кіраўніку Уладзю Бярбераву першым сярод калег атрымалася дасягнуць арганічнага спалучэння відаў і жанраў фальклорнага мастацтва на сцэне. І сёння гурт існуе, канцэртуе і рыхтуецца да запісу і вупуску доўгачаканага новага альбома [5].

**Спіс літаратуры:**


1. Мартыненка, В., Мяльгуй, А. 222 альбомы беларускага рок і ня толькі… / В. Мартыненка, А. Мяльгуй. – Мінск : Медысонт, 2006. – 448 с.
2. Матыліцкая, Н.В. Вопыт музейнай рэкрэацыі на аснове традыцыйных каляндарных свят 1998-1999 гг. / Н.В.Матыліцкая // Штудыі Рэспубліканскай сезоннай фальклорнай школы. – Мінск : БДУКМ, 2007. – С. 59.
3. Назіна, І.Д. Беларускія народныя музычныя інструменты / І.Д.Назіна. – Мінск, 1997.– 239
4. Неклюдов, С. Ю. После фольклора / С.Ю. Неклюдов // Живая старина. – Москва, № 1, с. 2–4
5. Уладзімір Бярбераў («Ліцвіны»): Новы альбом ужо існуе ў маёй галаве. Інтэрв’ю [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://metalscript.net/2012/09/licviny-novy-albom-intervyu/. – Дата доступу : 07.04.2014.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ